саломіну», перакідваць велізарныя камяні, «бы картоплю». У свайго бацькі каваля, які адвозіў яго ў лес і пакідаў там, а потым не пазнаў сына ў абліччы багатыра, ён выкаваў такую булаву, што ўтраіх варочалі з цяжкасцю. Багатыр жа «пакруціў яе адной рукою да як шыбануў угору, дак яна няведама дзе й дзелася». Не скора булава вярнулася, ударылася аб падстаўленае багатыром калена і «трохі скрывілася». Багатыр здзяйсняе подзвігі, у выніку якіх перамагае 12-галовага змея-людаеда і вызваляе царэўну. Але іншыя багатыры, якіх ён сустрэў, забіваюць яго, каб ажаніцца з царэўнаю. У спрэчцы, каму павінна дастацца царэўна, яны пазабівалі адзін аднаго. Дзівосныя памочнікі заяц і воўк ажывілі бязногага багатыра, памаглі хутчэй дабрацца да цара. Багатыр павёз царэўну да бацькі. Ён выкрыў злачынца, ажаніўся з царэўнаю, «заўладаў палавінаю царства». Перамагла справядлівасць: багатыр знайшоў сваё шчасце, а «ліхога багатыра павесілі». Казка шырока бытавала ў 19—20 ст.

*Літ.*: Сержпутоўскі А.К. Казкі і апавяданні беларусаў з Слуцкага павета. Л., 1926. С. 47—52.

*А. С. Фядосік.*

**«БЯЗРУ́ЧКА»**, казачны сюжэт СУС 706 і персанаж *чарадзейных казак* пра бязвінна пакрыўджаных. Казка шырока бытавала ў Беларусі, Расіі, Украіне, Польшчы. Бел. варыянты апублікаваны ў зборніках М.Дзмітрыева, Е.Раманава, П.Шэйна, М.Федароўскага. Яшчэ 14 варыянтаў запісаны ў 1860—80-я г. Два з іх апублікаваны ў зб. «Чарадзейныя казкі». (ч. 11, №№ 60, 62), што сведчыць пра ўстойлівае бытаванне твора. Непрыязныя, варожыя адносіны братавай жонкі да яго сястры — у аснове канфлікту. Клопат брата пра сястру, яго ўвага да яе выклікаюць зайздрасць жонкі, якая ўзводзіць на дзяўчыну паклёп. Спачатку абвінавачвае яе ў страце каня, каровы, нарэшце ў забойстве дзіцяці, якое сама ж і загубіла. Брат карае сястру: адсякае ёй рукі і выганяе з дому. Вандруючы, яна сустрэла каралевіча і ўзяла з ім шлюб, але зноў абгавораная і з малым дзіцем на руках вымушана ісці ў свет. Праз некаторы час адбываецца дзівоснае вылячэнне сястры. Яна, непазнаная, сустракаецца з мужам. Хлопчык расказвае бацьку «казку», якая ўсё тлумачыць і выкрывае вінаватых. Вобраз Б. выклікае спачуванне і сімпатыі слухачоў не толькі таму, што яе беспадстаўна крыўдзяць, але і таму, што яна мужна пераносіць удары лёсу. Ідылічна пададзены ў казцы ўзаемаадносіны брата і сястры. Яны могуць быць узорам узаемаадносін сваякоў. На гэтым фоне яшчэ больш агіднымі здаюцца ўчынкі братавай жонкі.

*Літ.*: Чарадзейныя казкі. Ч. 2. Мн., 1978; Бараг Л.Р. Сюжэты і матывы беларускіх народных казак. Мн., 1978. С. 103.

*К. П. Кабашнікаў.*

**БЯЛУ́Н**, міфічная істота, адно з бажышчаў бел. дахрысціянскага пантэона. Бог багацця і міласэрнасці Б. атаясамліваўся з праборам, галоўным добрым Богам, Белбогам. А.Кіркор лічыў Б. галоўным Богам бел. міфалогіі, бацькам Перуна. Беларусы ўяўлялі Б. старым з доўгай белай, але не сівой барадою, у белым саване, з белым посахам. Ён часам сыходзіць на зямлю. Паказваецца толькі ўдзень або пры месячным святле. Б. нібыта з'яўляецца тым, хто заблудзіўся ў лесе, і моўчкі, амаль нябачна, выводзіць падарожных на правільную дарогу, з якой яны збіліся. Таму існуе прымаўка «Без Белуна цёмна ў лесе». Лічылі таксама, што Б. жыве ў жыце і з вялікай торбаю грошай на носе паказваецца бедняку, які ідзе па дарозе, падклікае яго да сябе рукою. Пры нерашучасці бедняка падысці Б. сам падыходзіць да яго і просіць уцерці яму нос, з якога цячэ. Калі той паслухаецца і ўтрэ, ці хоць бы дакранецца да носа, з торбы пасыплюцца грошы або золата і Б. знікае. Колькасць грошай можа залежаць ад таго, чым бядняк утрэ нос Б.: калі рукою, то грошай з торбы пасыплецца столькі, колькі можна забраць рукою; калі ж хусткаю ці шапкаю, ці крысом світкі, то атрымаецца столькі, колькі можа змясціцца ў пералічаных рэчах. Пра такога шчаслі́ўца кажуць: «Мусіць, пасябрыўся з Белуном». Б. літасцівы і творыць дабро. У час жніва любіць з'яўляцца на нівах і нават дапамагае жнеям, асабліва добрым работніцам.

*Літ.*: Древлянский П. [Шпилевский П.]. Белорусские народные поверья // Журн. М-ва нар. просвещения. 1846. Прибавления. Кн. 1; Носович И.И. Белорусские песни // Зап. имп. Рус. геогр. о-ва по отд-нию этнографии. СПб., 1873. Т. 5; Живописная Россия: Отечество наше в его зем., ист., плем., экон. и быт. значении. Т. 3, ч. 2. Белорусское Полесье. СПб.; М., 1882. С. 272;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Зайкоўскі Э. Бялун // Беларуская міфалогія: Энцыкл. слоўн. Мн., 2004. С. 55—56.

*У. А. Васілевіч.*

**БЯЛЯ́ЕЎ** Віктар Міхайлавіч (6.2.1888, г. Ніжнеўральск, Расія — 16.2.1968), рускі музыказнавец (тэарэтык, гісторык), фалькларыст. Доктар мастацтва-знаўства (1944). Скончыў Петраградскую кансерваторыю (1914). Аўтар фундаментальных навуковых прац, прысвечаных творчасці рускіх і заходнееўрапейскіх кампазітараў, музыцы народаў СССР і замежнага Усходу, палеаграфіі і натацыі, тэорыі і гісторыі музыкі. Асноўная беларусазнаўчая праца Б. — манаграфія «Беларуская народная музыка» (1941), дзе на аснове абагульнення і сістэматызацыі фалькл. запісаў упершыню ахарактарызаваў найважнейшыя тыповыя рысы бел. нар. музычнай творчасці (пераважна песеннай) па іх параметрах: ладавая структура, мелодыка, рытміка, форма і жанры. У гісторыі бел. этнамузыказнаўства намеціў шляхі комплекснага абагульнена-тэарэтычнага даследавання музычнага фальклору. Падрыхтаваў і выдаў шэраг зборнікаў нар. песень. Сярод вучняў В*Ялатаў*.

*Тв.:* Очерки по истории музыки народов СССР. Вып. 1—2. М., 1962—63; Связь ритма текста и ритма мелодии в народных песнях. М., 1966.

*Літ.:* В.М.Беляев, 1888—1968. М., 1990; Можейко З. Белорусский музыкальный фольклор в исследованиях Ф.Рубцова, К.Квитки, В.Беляева // Белорусская этномузыкология: Очерки истории (XIX—XX вв.). Мн., 1997.

*Т. Б. Варфаламеева.*

**БЯРКО́ВІЧ** Таццяна Леані́даўна (н. 21.1.1970, г. Вілейка), этнамузыколаг. Кандыдат мастацтвазнаўства (1999). Скончыла Бел. кансерваторыю (1994). З 1997 на кафедры бел. музыкі ў Бел. акадэміі музыкі (БДАМ), з 2003 загадчык кабінета нар. музыкі. Узначальвае работу па сістэматызацыі матэрыялаў фонаархіва этнамузыкі БДАМ, стварэнні страхавога фонду экспедыцыйна-палявых фоназапісаў, камп'ютэрнай базы даных. Распрацоўвае пытанні фенаменалогіі рытуальна-гульнявых форм бел. каляндарна-песеннага меласу, механізмы мелатворчых працэсаў у абрадава-гульнявых формах фальклору. Даследуе фарміраванне меладычных тыпаў, замацаваных за рытуальна значнымі гульнямі салярнага цыкла («Барана», «Жаніцьба Цярэшкі», «Яшчар», «Ваджэнне «казы»).

*Тв.:* «Яшчар» як песенна-гульнявая дзея зімовага перыяду // Беларускі музычны фальклор у даследаваннях маладых этнамузыколагаў. Мн., 1996. Вып. 2; Напевы «Ваджэння Казы» і «Жаніцьбы Цярэшкі» ў аспекце гетэратопіі абрадава-гульнявой песеннай прасторы // Беларуская музыка: Гісторыя і традыцыі. Мн., 2003.

*З. Я. Мажэйка.*

**БЯРО́ЗА**. Дрэва Б. ў міфапаэтычнай мадэлі свету выступае як дрэва-першапродак, дрэва-ахоўнік і медыятар паміж светам жывых і светам памерлых. Сімвалізуе жаночы пачатак і менавіта таму стала вызначальным атрыбутам шэрагу святочных рытуальна-абрадавых комплексаў, асноўнымі ўдзельнікамі якіх былі дзяўчаты перадшлюбнага ўзросту. Эпіцэнтрам рытуальных стасункаў моладзі з Б. быў час пераходу вясны ў лета, якому адпавядаў багаты цыкл траецка-сёмушных святкаванняў. У гэты час кожная сям'я аздабляла свой падворак і хату маладой зелянінай («май»). Вароты, сцены хлява, дзверы ў хату, вуглы, сенцы былі ўпрыгожаны галінкамі магічна-ахоўнага дрэва. Б. ставілі і ў двары перад кожным акном хаты, што павінна было сімвалізаваць злучанасць кожнага з трох пакаленняў сям'і, якія жылі пад адным дахам, у чарговы кругаварот жыцця, у веснавы вір прыроднага абуджэння і росквіту. Бярозавыя гаі станавіліся ў гэты час месцам духоўнай ініцыяцыі дзяўчат перадшлюбнага ўзросту. У чацвер траецкага тыдня, на Сямік, яны збіраліся гуртам і ішлі «завіваць бярозкі»: прыгіналі вершаліны двух блізкіх дрэў і папарна сплятаді іх у вянок, а пасля выконвалі абрад *Кумлення* — кожная са сваёй сяброўкай праходзіла праз утвораную арку. Гэты рытуал і сімвалізаваў змену сацыяльнага статуса іх удзельнікаў. Акрамя таго, дзяўчаты пускалі на ваду бярозавыя вянкі, каб паваражыць пра свой далейшы лёс. У міфалагічных легендах русалка выходзіць з вады і гойдаецца на бярозах. Бярозавы вянок выконваў ролю не толькі прадказальніка, але і засцерагальніка. Каб перасцерагчы статак ад ваўкоў і паспрыяць яго малочнасці, пастухі завівалі вянкі і надзявалі іх на рогі каровам. На Брэстчыне існаваў вясельны рытуал: вяртаючыся з-пад вянца, вясельны картэж праязджаў пад жывой бярозавай ар-



*В. М.* ***Бяляеў***.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ